– Некоторая связь здесь есть. Не исключено, что они сегодня тоже думают, что никто их не будет искать. Нет в Беларуси такого опыта, не было суда над коммунизмом. Хотя документы ведь имеются, можно найти практически всех (95% так точно) тех, кто участвовал в большом терроре, назвать каждого, кто пытал.

Но сейчас режим особенно не заинтересован в этом. Потому что, осуждая преступления той власти, надо быть готовым, что их тоже осудят за террор против своего народа.

– Недавно Лукашенко подписал декрет, по которому власть в случае его устранения должна перейти Совбезу. Оглядываясь на историю, насколько вам видится дееспособным это решение?

– Дело в том, что у нас есть полная аналогия, когда после смерти Сталина люди из его окружения стали бороться за власть. Там ведь тоже не было прямого наследника или кого-то, кто подхватил бы власть. Было Политбюро, ЦК, какие-то коллегиальные органы, между которыми и шла эта борьба. И очень жесткая.

Назначить главным Совбез – это самый худший вариант. Во-первых, люди, которые находятся у власти, уже прошли определенный естественный отбор. Сейчас они готовы подчиняться любым приказам. Но когда эти 20 человек потеряют своего лидера и окажутся на одном уровне, каждый будет считать, что это он должен быть лидером. Там, думаю, будет борьба похлеще, чем после смерти Сталина.

Во-вторых, в Совбезе в основном силовики, которые представляют разные военные ведомства. Кто-то МВД, кто-то КГБ, кто-то армию, то есть за каждым из них стоит конкретная сила. Ужас, что может начаться, когда они станут выяснять отношения. Поэтому очень опасно оставлять власть не одному человеку, а сразу нескольким силовикам.

– Из истории мы знаем, что советский режим не рухнул со смертью Сталина. Однако то, что было после, несоизмеримо даже в плане репрессий. Как видится наше разрешение ситуации?

– Хороший пример. Это к вопросу о роли личности в истории. Вот стоял один маньяк и кровопийца Сталин, а потом на смену ему пришел другой человек, вроде бы из той же системы, вроде бы сам замешан в репрессиях. Но уже при Хрущеве не было таких массовых операций, не убивали людей. Идеология та же, в книжках Ленин, вокруг все твердят про коммунизм – просто поменялся один человек. И как система начала меняться!

Брежнев, Горбачев ведь тоже были коммунистами. И, оказывается, можно быть коммунистом и необязательно убивать людей сотнями тысяч, а то и миллионами.

– То есть иногда проблема только в одном человеке? И необязательно на смену одному Лукашенко придет другой Лукашенко?

– Да. Мы видим это и по Сталину, и по Гитлеру. Один человек подметает под себя всю систему, и система становится похожей на него. И уже начинают соревноваться, кто неадекватнее и придумает более фантастическую ложь. И появляются «заговоры Федуты» и джипы с пулеметами. И даже находятся те, кто верит. Для всех для нас это тест на вменяемость.

Катастрофа, когда один человек, живущий в своих фантазиях, в мире, совершенно оторванном от реальности, прогибает под себя всех. Поэтому не исключено, что и в этой системе могут произойти перемены с уходом конкретного человека, что даже сама система сможет избрать того, кто хотя бы понимает, что такое современный мир, что такое человеческие ценности, что нельзя уничтожать свой народ и нельзя настолько откровенно лгать.

(«Салідарнасць»)

ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ

Анатоль Лябедзька адпачывае ў Грузіі

Палітык паляцеў у Батумі разам з жонкай амаль адразу пасля вызвалення з ізалятара, дзе былі створаны нечалавечыя ўмовы ўтрымання.



Нагадаем: за кратамі былы старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі правёў 30 сутак.

Некаторыя адзначалі, што пасля выхаду на волю Лябедзьку было не пазнаць – складаныя ўмовы адбіліся, магчыма, не толькі на яго знешнасці, але і на здароўі. Таму такі рэлакс для палітыка – не раскоша, а сапраўдная неабходнасць. *«Вяртанне да жыцця!»* – пракаментаваў адзін з першых сваіх марскіх заплываў у гэтым сезоне вядомы беларускі апазіцыйны палітык.

Анатоль Лябедзька падарожнічае разам з блізкімі людзьмі, ён пабываў ў самай старой крэпасці Грузіі – Гоніа-Апсароскай – і іншых выдатных месцах краіны, у якую яшчэ можна свабодна паляцець з Беларусі самалётам.

«Вадаспад Махунцэці, вадаспад кахання. Беражыце родных і блізкіх!» – так падпісаў Анатоль Уладзіміравіч адзін са сваіх здымкаў разам з жонкай Святланай, размешчаны ў «Інстаграме».

Паліна ПЛАТОНАВА.

СКАЗАНО!

Олег ГАЙДУКЕВИЧ, председатель Либерально-демократической Беларуси, депутат Палаты представителей:



«...И еще! О санкциях в целом. Я убежден, что они сделают страну сильнее, другого пути у нас нет. Символично что санкции ввели 21 июня, за день до трагической и святой даты для нашей страны. Ну чем всё закончилось – мы помним».

(Комментируя решение Европейского Союза о введении санкций против Беларуси.)

РЕАКЦИЯ

Андрей ДМИТРИЕВ, лидер общественной организации «Говори правду»:



«Если санкции, по вашим словам *(обращаясь к О.Гайдукевич. – **Ред.**)*, сделают страну сильнее, почему вы против них выступаете? Вы что, против сильной Беларуси?»

ЧУЛІ?

Мінюст ліквідаваў аналітычны цэнтр эканаміста Яраслава Раманчука

Вярхоўны суд з ініцыятывы Міністэрства юстыцыі ліквідаваў дзве грамадскія арганізацыі, паведамляецца на сайце Мінюста. Гэта рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне *«Аналітычны цэнтр «Стратэгія»*, якім кіраваў эканаміст **Яраслаў Раманчук**, і грамадскае аб'яднанне *«Беларуская асацыяцыя жанчын-юрыстаў»*.

Падставай для ліквідацыі стала тое, што абедзве арганізацыі цягам трох гадоў не падавалі ў Мінюст у належны тэрмін інфармацыю пра сваю дзейнасць.

ЗДАРЭННЕ

Моцна паранены беларускі добраахвотнік «Волат»



На расійска-ўкраінскай вайне цяжка паранены беларускі добраахвотнік з пазыўным «Волат». Ён атрымаў аскепкавае раненне галавы і ў вобласць сэрца. Аскепак з галавы ўжо выняты, але яшчэ мае адбыцца аперацыя па выняцці аскепка каля сэрца. Цяпер «Волат» у штучнай коме і на штучнай вентыляцыі лёгкіх.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ



Суддзяў прыраўнялі да глухіх: страцілі яны і зрок, і слых

На інфармацыйных стэндах некаторых мінскіх паліклінік з'явілася аб'ява: нароўні з пацярпелымі ад чарнобыльскай катастрофы, вязнямі фашысцкіх канцлагераў, інвалідамі па слыху і г.д. у першую чаргу абслугоўваюцца… суддзі.

Паліклініка, як вулей,
Як пчаліны рой, гудзе.
У чарзе сядзяць бабулі
І дзядулі дзе-нідзе.
(Акурат сказаць дарэчы,
Што здароўе дзень пры дні
Там шукае люд старэчы,
Бо яго няма ані.)
І чамусь па калідоры
Борздка крочыць маладзён.
Не відно, што надта хворы,
Што здароўе страціў ён.
Позірк кінуў падазрона
На старэчую чаргу.
І вердыкт ад маладзёна:
– Гэтак доўга не магу
Я чакаць ля кабінета.
Прапусціце без чаргі.
Быў адказ яму на гэта:
– Пачакаеш, дарагі!
Нам таксама неахвота
Тут выседжваць…
– У мяне
Ёсць адна, бабулькі, льгота.
Вунь жа спісак на сцяне
Тых асоб, што маюць права
Без чаргі зайсці туды.
– Што за льготнік ты, цікава?
Не глухі. І малады
Для чарнобыльскай ахвяры,
Для далёкае вайны, –
У старых ва ўхмылках твары,
Насміхаюцца яны. –
Ёсць яшчэ і ў суддзяў льготы –
Эканоміць трэба час.
Дык скажы нам, братка: хто ты?
– Я, сябры, суддзя якраз!
Сталі змрочнымі бабулі,
Сталі хмурымі дзяды,
Калі гэтае пачулі…
– Многа ты прынёс бяды
Шараговым беларусам, –
Строга дзед сказаў яму. –
Вершы ты ў мундзірах хлусам,
Выпраўляючы ў турму
Тых, хто крыкнуў нешта дзесьці,
Слова мовіў папярок…
– Давялося ўнуку сесці, –
Прагучаў услед папрок. –
Нейкі здымак з інтэрнэту
Ён змясціў у «Інстаграм».
Дык суддзя сказаў: «За гэта
Я пятнаццаць сутак дам».
– А ў мяне на месяц цэлы
Пасадзіў суддзя дачку:
Парасон чырвона-белы
Узяла яна ў руку…
Маладзён усклікнуў:
– Годзе!
Не ўшчувайце, бо людзей
Я, сябры, суджу на лёдзе –
Абслугоўваю хакей.
Сцэна, так сказаць, нямая…
Моўчкі думалі дзядкі:
Можа, ўвогуле не мае
Прывілей суддзя такі?
Зрэшты, стаўленне другое
Да хакейнага суддзі.
– Не вымучвайся чаргою,
Без чаргі, браток, ідзі!
***
Да судоў у нас – агіда:
Папсавалі людзям кроў,
Бо не чуе ўжо Феміда
Аргументаў «бунтароў».
Як глухія суддзі сталі,
Быццам затычкі ў вушах.
І кладуць яны на шалі
Хлуд такі, што проста жах;
Не злічыць прысудаў карных.
І таму, напэўна, іх,
Даўшы льготу, у лякарнях
Прыраўнялі да глухіх…

Калі талент засох

Засох ваш талент?
Горка стала?
Давяць парады не люблю,
Аднак жа гэта не падстава,
Каб закапаць яго ў зямлю…

Залаты характар

Мяне хто толькі ні кляне:
Жанкі, сябры, браты!..
Цяжкі характар у мяне,
Таму што залаты.

ЛИЧНОСТЬ

Елена ЗОЛОВА: «Петь для меня так же естественно, как и говорить»

Она не представляет своего утра без аромата кофе. Любит бег и езду на велосипеде. Она – то исключение, которое подтверждает правило, что дружба между мужчиной и женщиной все-таки существует.

Ее дедушек называли богатырями – рост под два метра. А она хрупкая и миниатюрная. Хотя диеты – совсем не про нее. Она искренне признается в том, что работа в ее жизни значит практически всё. При этом она прекрасная мама взрослой дочери. И любимая жена.

Сейчас она готовится к премьере – партии Надежды Яновской в опере В.Солтана «Дикая охота короля Стаха». Наша героиня – человек-солнце, оперная певица **Елена Золова**.

***

– Я с детства была погружена в творческую атмосферу. Этому способствовала, безусловно, земля, на которой я выросла, – Восточная Украина, мамина родина. В поселок около Луганска, где располагался наш дом, постоянно приезжали цыгане, а это костры, кибитки, песни, танцы и… бабушкины страхи, что меня могут украсть. Поэтому мне было строго-настрого запрещено приближаться к этому миру, который меня очень манил. Притягивал ореол тайны, что окружал цыган. Если меня в то время спрашивали, кем я хочу быть, когда вырасту, отвечала: «Цыганкой». Для меня это было синонимом слова «артист».

С трех лет я устраивала представления для бабушки и мамы: создавала из табуреток сцену, выходила и пела. Первую песню – «Катюша» – выучила в два годика. Вечерами, после работы, наши соседи собирались вместе – с гитарами, гармошками. Щелкали семечки, пели и танцевали. Моим коронным номером была песня «Крутится, вертится шар голубой…». В детском саду также свой актерский потенциал не скрывала, все Лисички и Снежинки были моими. А уже в школу я пошла в Беларуси, когда вернулись с мамой на родину папы – в Гродненскую область, город Сморгонь.

***

– Музыкальную школу у меня так и не получилось окончить. Я хотела играть только на фортепиано, но у нашей семьи не было достаточно средств, чтобы приобрести такой дорогой инструмент. А флейта или баян меня не очень привлекали тогда.

Но я училась в школе с музыкальным уклоном, где мне посчастливилось встретиться с чутким преподавателем Любовью Петровной Лобань. Можно сказать, она и направила меня в музыку. Я солировала в хоре и в вокальном ансамбле, получала азы сольфеджио, а на переменах между уроками бежала в актовый зал, где стояло пианино. И на слух подбирала на нем самые разные мелодии. Потом, уже в Минске, в Академии музыки, замечательный дирижер Лев Поликарпович Лях говорил: уши – твое счастье и твой талант.

После 9 класса я увлеклась эстрадным пением, исполняла репертуар Ирины Аллегровой и Анжелики Варум на самых разных конкурсах, получала награды и грамоты. «Ты загубишь голос!» – ужасалась Любовь Петровна. И убедила меня после 11 класса поступать в музучилище в Молодечно. Но туда я благополучно не прошла. Мой громкий плач слышал в тот день не только весь подъезд, но, кажется, весь двор.

Чтобы иметь возможность посещать подготовительные занятия с преподавателями для поступления в музучилище, поступила в ПТУ на фрезеровщика. Мальчики выпиливали для меня все необходимые материалы, а я подметала стружку. Так проходила моя учеба.

А на следующий год я поступила в музучилище сразу на 2-й курс! Но учиться было невероятно сложно: в первом семестре по предмету «Музыкальная литература» получила «двойку». Вы не представляете, как это ударило по самолюбию! И с 6 утра я уже сидела в вокальном классе, а как только открывалась библиотека-фонотека – бежала туда. Надевала наушники и слушала музыку, постоянно. Быть в хвосте не позволял характер: я должна быть лучшей, первой! В итоге – заслуженная «пятерка».

Именно тогда, когда я была погружена в звуки музыки невероятной красоты, осознала: хочу заниматься оперным пением. Понимала, что это непросто, но трудности меня и привлекали. Каждый шажочек вперед словно окрылял. Желание найти себя на эстраде пропало. Только опера!

***

– Думала, что следующим моим шагом будет Москва. Решила, что буду поступать в консерваторию им.П.И.Чайковского. Села на поезд и поехала. Это был мой первый приезд в Москву. К заветному учебному заведению я шла через весь город от вокзала пешком. Пришла и просто сказала на вахте: «Мне надо прослушаться. К кому идти?» Так попала к Кларе Григорьевне Кадинской. Она вынесла вердикт: надо приехать с другой программой, и уже не к ней. «Я заведу тебя к преподавателю, у которого будешь учиться», – пообещала Клара Григорьевна.

Окрыленная, поехала домой. Но следующего раза не произошло: я узнала, что у меня будет ребенок, доченька. С мужем мы познакомились на вокзале в Молодечно, я ехала из Сморгони, он – из Лиды. Вокзал стал местом нашей встречи. Олег не связан с миром музыки, он инженер-экономист, но очень любит оперу. В общем, поступала я в Белорусскую государственную академию музыки, когда Даше исполнилось 7 месяцев. Я не молчала ни дня, пела во время беременности и сразу после родов. Мой золотой муж поддерживал меня во всем. Помогали и свекровь, и мама.

На подготовительном отделении БГАМ попала к Ирине Семеновне Шикуновой, удивительно теплому, щедрому, доброму человеку и высокому профессионалу. Она всегда в моем сердце. Хотя она всем своим ученицам была словно мама, от некоторых девочек часто слышала: «Тебя она любила больше всех…» Ирина Семеновна как-то призналась, что я напоминаю ей ее саму. «Тебе надо до всего докопаться и понять суть. Ты задаешь так много вопросов и всем интересуешься!..» – говорила она. И это правда. Оперное пение, работа над голосом стали смыслом моей жизни. Так остается и по сей день.

***

– Убеждаюсь всякий раз: мысли материальны. Студенткой БГАМ каждый раз, проходя мимо театра, повторяла про себя: я буду работать здесь, в Большом. С первого курса отправляла эти мысли в космос, а к 4-му они ко мне вернулись.

Кстати, при первой встрече с мужем на его вопрос, чем я занимаюсь, ответила: «Я – оперная певица». Так всегда представлялась и в дальнейшем. Так и получилось!

О чем мечтаю сейчас? Петь и продолжать развиваться профессионально, не останавливаться, двигаться вперед. Мне недавно предложили спеть партию Аиды в шедевре Дж.Верди. А это не та роль, которая делается по щелчку. И я люблю погружаться в материал, искать свой звук. Для меня пение – словно разговор, и в этой беседе со зрителем никому из нас не должно быть неудобно. Как говорю – так и пою. Но к этому необходимо прийти. Причем в любой партии.

***

– Муж не ревнует к профессии и партнерам по сцене. Ну, или ловко это маскирует. *(Смеется.)* Он, конечно, смотрел все спектакли с моим участием. Но для него существует одно табу: Олег никогда не приходит на премьеру. Говорит, что боится: «Тебе надо собраться и сконцентрироваться. Ты и так будешь волноваться, а тут еще и я сижу в зале». Наверное, опасается нарушить магическую ауру спектакля…

Кстати, дружба между мужчиной и женщиной возможна. Стопроцентно. Так у меня сложилось с Алексеем Микутелем *(солист оперы Большого театра Беларуси. – **Прим. ред.**)*. Удивительный человек, с которым комфортно как в обычной жизни, так и на сцене. Помню, как-то режиссер Андрейс Жагарс сказал: «Леша не думает о себе на сцене – он думает исключительно о своей партнерше». И это действительно так.

***

– Я мама взрослой дочери, и это прекрасно! Если честно, сама не верю, что Даше уже 20 лет и она уже замужем. Но бабушкой становиться пока не хочется. *(Улыбается.)*

Дочь занималась иностранными языками с пяти лет. В ее арсенале – английский, чешский, итальянский, китайский. Сейчас учится в университете Китая. Она играет на гитаре и очень даже неплохо поет. У нас был с ней серьезный разговор по поводу ее карьеры певицы, я открыто спросила: «Ты действительно хочешь этим заниматься? Да, у тебя есть все данные. Но это профессия, которая не принесет много денег. Кроме того, требует крепкой нервной системы. Здесь очень много поводов расстраиваться… Насколько тебе это нужно?» Решили, что продолжать династию оперных певцов Дарья все-таки не будет. Но в ней, безусловно, живет артистка. Она очень творческий человек: рисует, пишет стихи и даже книги. У нас доверительные отношения, но не могу сказать, что мы подружки: дистанция, пусть минимальная, но есть…

Елена БАЛАБАНОВИЧ.
Фото М. НЕСТЕРОВА и из личного архива артистки.
(«Алеся».)



«Для меня пение – словно разговор, и в этой беседе со зрителем никому из нас не должно быть неудобно. Как говорю – так и пою.



Елена и ее муж Олег.



Виолетта Валери в постановке А.Жагарса оперы Дж.Верди «Травиата».

БЛИЦ-ОПРОС

– Почему надо идти в оперный театр?
– За эмоциями и настроением. Музыка – это бальзам для сердца и души. Это то, что дарит крылья и наполняет тебя смыслом.

– Книга?
– Сейчас – «Дикая охота короля Стаха» В.Короткевича.

– Цветы?
– Орхидеи.

– Любимая территория дома?
– Кухня. Очень люблю печь сладкое – торты и печенье. Все это съедает муж. Он страшный сладкоежка.

– Спорт?
– Он сопровождает меня всю жизнь. В школе – легкая атлетика, метание ядра, прыжки в длину, дзюдо, самбо, танцы. Сейчас увлеклась бегом и с удовольствием катаюсь на велосипеде.

– Следуете моде?
– Считаю, что нужно носить то, что подходит лично тебе, в чем чувствуешь себя уверенно и комфортно.

– Украшения?
– Я не сорока, не бросаюсь на всё, что блестит.

– Диеты?
– Это не про меня. Могу прийти после спектакля и плотно покушать на ночь.

– Аромат?
– Chloé Summer.

– Утро не утро без?..
– Кофе и шоколада.

– Качества, которые подкупают в человеке?
– Искренность, честность и порядочность.

– Никогда не простите…
– Предательство.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

Валянціна ЗЕЛЯНКЕВІЧ: «Жыццё яшчэ не раз ударыць тварам аб асфальт…»

Вядомая беларуская трыятланістка, якая тры тыдні таму трапіла ў Маскве ў аварыю, распавяла, як сябе адчувае пасля аперацыі.



Валянціна Зелянкевіч раней выступала за зборную Беларусі па трыятлоне. Уладальніца юніёрскага рэкорду краіны, шасціразовая пераможца адкрытага Кубка Мінска, сем разоў была першай у першынстве Беларусі.

У жніўні мінулага года Валянціна падпісала ліст з патрабаваннямі да ўлад Беларусі правесці паўторныя выбары прэзідэнта, а таксама спыніць гвалт з боку сілавікоў у дачыненні да ўдзельнікаў акцый пратэсту. Пасля гэтага яна засталася без працы і пераехала ў Расію.

Зараз спартсменка працуе трэнерам па плаванні ў клубе трыятлона ў Маскве. Як кажуць, жыццё толькі пачало прыходзіць у норму, як на Валянціну абрынулася новае няшчасце – на пачатку гэтага месяца яна трапіла ў аварыю.

«*Падчас трэніроўкі на веласіпедзе мяне збіла машына*, – паведаміла Валянціна. – *Удар прыйшоўся ў падбародак, я зламала сківіцу, выбіла і раструшчыла зубы. Пералом сківіцы ў трох месяцах. Патрэбна аперацыя… Бальніцы ў Расіі – гэта проста жах!*»

Таксама спартсменка апублікавала відэа з машыны «хуткай». У роліку яна выказвала незадаволенасць працай медыкаў. Хаця праз нейкі час усё-такі выбачылася за сваю нястрыманасць і патлумачыла, чаму запісала свой эмацыйны зварот:

«Як складана, здараецца, прамаўчаць і не адказаць на прыніжэнне і абразы. Як складана падчас выказаць сваё меркаванне, пры гэтым нікога не пакрыўдзіўшы. Як складана падчас нешта камусьці давесці...

Я не хачу высвятляць, хто мае рацыю, а хто вінаваты, хто правільна паступіў, а хто не. Хачу толькі застацца пры сваім меркаванні і жадаю апанентам таго ж. І, вядома ж, нікому не жадаю апынуцца на маім месцы і праверыць, як паводзілі б сябе вы ў стане шоку і афекту. Калі плюеш на асфальт акрываўленымі зубамі…

Я толькі вучуся быць больш памяркоўнай, любіць тых, каго я бачу перад сабой, і даравацъ людзям усё, што адбываецца.

Зараз я прашу ў медыкаў прабачэння. Ведаю, што людзі ў белых халатах таксама стамляюцца, таму ўсе тыя, хто стаміўся, – прабачце мяне і адпраўляйцеся ў адпачынак, бо ў такім стане вы шкодзіце не толькі сабе. Адпусціце ўсе крыўды – у сабе іх трымаць нельга».

Валянціне Зелянкевіч зрабілі аперацыю, і зараз яна выглядае значна лепш, чым тры тыдні таму.

«*Калі гэта мяне не забіла – значыць, зрабіла мацнейшай*, – аптымістычна адзначыла спартсменка. – *Усё жыццё – адзін вялікі прыкол…*»

На мінулым тыдні спартсменка адзначыла 22-годдзе, атрымала падарункі са словамі падтрымкі ад сяброў ды блізкіх і глядзіць у будучыню з аптымізмам.

«*Дзякуй усім, хто побач!* – кажа Валяціна. – *Усім, хто мне дапамагае, на маім няпростым, але вельмі цікавым жыццёвым шляху.*

Я ведаю, што ўсё толькі пачынаецца і жыццё мяне яшчэ не раз ударыць тварам аб асфальт. Але я прашу толькі аб адным: даруйце мне ўсё, што можна даравацъ. Я не самы просты чалавек, але спадзяюся, што добры.

…А пасля аперацыі я ўжо як новая. Зараз вучуся ўсміхацца больш сціпла».

Алесь СІВЫ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Міхаіл ЗАХАРАЎ: «Пакуль адпачываю…»

Экс-галоўны трэнер зборнай Беларусі па хакеі яшчэ не знайшоў сабе новае месца працы.



Міхаіл Захараў – заслужаны трэнер Беларусі. У якасці настаўніка мінскага «Юнацтва» восем разоў выйграваў чэмпіянат краіны, шэсць разоў перамагаў у Кубку Беларусі, тройчы – у Кантынентальным кубку.

Узначальваў маладзёжную і юніёрскую зборныя Беларусі. Кіраваў нацыянальнай камандай на чэмпіянатах свету 2004 і 2005 гадоў, падчас алімпійскай кваліфікацыі-2005, а таксама на Алімпіядзе-2010 у Ванкуверы.

У жніўні 2019 года быў прызначаны галоўным трэнерам зборнай Беларусі ў чарговы раз. Праўда, з-за пандэміі ў 2020 годзе чэмпіянат свету, які павінен быў прайсці ў Швейцарыі, адмянілі, таму праверыць каманду Захарава ў дзеянні не атрымалася.

А вось на гэты год беларускія спартыўныя чыноўнікі ўскладалі вялікія спадзяванні, бо першынство планавалася правесці ў Мінску і Рызе. У 2014 годзе чэмпіянат свету ў беларускай сталіцы прайшоў з размахам, тады даволі прыстойна выступіла і зборная Беларусі, якой кіраваў канадскі спецыяліст **Глен Хэнлан**.

Гэтым разам у нацыянальную каманду таксама сабралі ўсіх лепшых, да таго ж раздалі да першынства беларускія пашпарты некаторым замежным хакеістам, якія павінны былі ўзмацніць гульню зборнай.

Але першая аплявуха прыляцела яшчэ да чэмпіянату, калі стала вядома, што з-за той сітуацыі, што склалася ў Беларусі пасля мінулагодніх прэзідэнцкіх выбараў, Міжнародная федэрацыя хакея адмяніла правядзенне першынства ў Мінску. Усе спаборніцтвы былі перанесены ў Рыгу.

І вось тут Міхал Міхалычу Захараву варта было б насцярожыцца, бо Рыга для яго – гіблае месца. У 2005 годзе ў Рызе ў фінале алімпійскай кваліфікацыі на Гульні ў Турыне беларусы, якія яшчэ за 5 хвілін да заканчэння матча ўпэўнена перамагалі каманду Латвіі з лікам 4:2, умудрыліся за 140 секунд прапусціць тры шайбы і застацца за бортам Алімпіяды.

Сёлетні чэмпіянат свету па хакеі ў Рызе стаў для Захарава яшчэ большым жахам, хаця напярэдадні нападаючы зборнай **Сяргей Касціцын** казаў пра планы так: «*Міхаіл Захараў сказаў, што едзем за медалямі*».

У выніку зборная, прыехаўшы за медалямі, заняла перадапошняе месца на гэтым першынстве (ззаду засталася толькі Італія), і ад вылету ў ніжэйшы дывізіён каманду выратавала толькі пандэмія (у гэтым годзе элітную лігу ніхто не пакідае).

Захараў пасля гэтага кінуў камень у агарод хакеістаў: маўляў, многія не апраўдалі даверу.

«*Любому хакеісту трэба працаваць*, – заяўляў трэнер. – *Маладыя павінны браць прыклад з вопытных ігракоў – з таго ж Вовы Дзянісава, з Руслана Салея. А да Руслана ім усім пакуль, як да Луны. І варатарам, і абаронцам, і нападаючым – усім трэба працаваць*».

А вось сам Міхаіл Захараў вырашыў пакінуць гэтае месца працы і папрасіўся ў адстаўку. Зрэшты, было б дзіўна, калі б застаўся. Балельшчыкі гэтага проста не зразумелі б.

7 чэрвеня федэрацыя прыняла адстаўку Захарава, і з таго часу пра трэнера нічога не было чуваць.

– У мяне ўсё добра, зараз знаходжуся ў адпачынку, – паведаміў Міхаіл Міхайлавіч нашаму карэспандэнту.

– Былі прапановы па працаўладкаванні?

– Не было ніякіх прапаноў. Пакуль проста адпачываю, таму пра іншае не думаю.

– Чым займаецеся?

– Ды нічым асаблівым. Сям'я, хатнія справы…

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ЕВРО-2020

Кто станет чемпионом Европы?

Портал Gracenote назвал фаворита чемпионата Европы-2020, а также самую вероятную пару финалистов.

По мнению специалистов, самые большие шансы на итоговую победу у Англии – 16,5%, Бельгии – 15%, Франции – 11,8%, Италии – 10,1%, Испании – 7,6%, Нидерландов – 7,6%.

Также портал назвал самые вероятные пары финалистов: Бельгия–Англия – 7%, Франция–Англия – 5,9%, Италия–Англия – 5,2%, Испания–Англия – 4,3%, Бельгия–Нидерланды – 4,2%.

Боксеры научат футболистов «любить страну»

Генеральный секретарь Федерации бокса России **Кирилл Щекутьев** рассказал, что российские боксеры хотят провести совместную тренировку с футболистами национальной команды, после того как подопечные Станислава Черчесова вылетели с Евро-2020.

По словам Щекутьева, предложение о тренировке федерация направит в Российский футбольный союз в ближайшее время.

«*Нам, боксерскому сообществу, после Евро показалось, что у футболистов сборной страны не горят глаза. Сборная России по боксу хотела бы объяснить, что значит любить страну и биться за нее. Ведь боксер выходит в ринг без единого рубля и готов умереть за свою страну. А у футболистов такого нет, они думают о деньгах*», – сказал Кирилл Щекутьев.

Приехали с «подарками»

86 положительных тестов на коронавирус выявлено на пограничных пунктах Ваалимаа и Нуйямаа у граждан, вернувшихся в Финляндию из России.


Речь идет о болельщиках, которые прибыли в страну из Санкт-Петербурга после матча сборной Финляндии с командой Бельгии (0:2).

Приблизительно 800 человек пропустили через границу без тестирования из-за загруженности погранпункта Ваалимаа. Их обязали изолироваться и сдать тест через 72 часа. Всего же через два погранпункта прошли примерно 3600 человек.

По словам местного главврача Марьи **Лисы Мянтймаа**, уже имеются случаи, когда вернувшиеся в Финляндию туристы не уходили на самоизоляцию и посещали публичные места.

ШАХМАТЫ

Твор маэстра



Наступная задача належыць старэйшаму беларускаму шахматнаму кампазітару **Уладзіміру Пятровічу Сычову** *(гл.дыяграму).*

Белыя: Кра8, Фе7, Лс2, Ле2, пп. с4, е4, g2 (7).

Чорныя: Крd3, Лd4, пп. d6, g7, h2, h6 (6).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі ***(220030 г.Мінск, вул. Энгельса, 34а)*** або на электронны адрас ***vadim_ne67@mail.ru.***

Вопыт і маладосць

Як мы паведамлялі раней, у Мінску прайшлі чэмпіянаты Беларусі сярод мужчын і жанчын (адпаведна 23 і 12 удзельнікаў, якія гулялі па швейцарскай сістэме ў 9 тураў). У мужчынскім турніры сярод іншых змагаліся пяць гросмайстраў, чатыры міжнародныя майстры і чатыры майстры ФІДЭ, у жаночым – чатыры майстры ФІДЭ.

Сярод мужчын доўгі час лідзіравалі маладыя шахматысты, але на фінішы наперад выйшлі больш вопытныя гросмайстры. Чэмпіёнам краіны ўжо не першы раз стаў **Кірыл Ступак** – 7 балаў. На другім месцы – **Аляксей Фёдараў** (6), на трэцім – малады майстар ФІДЭ **Арцём Сіняўскі** (таксама 6). Непасрэдна за прызавой тройкай у турнірнай табліцы размясціліся **Максім Царук**, **Дзяніс Лазавік**, **Ігар Люцко**, **Мікіта Маёраў** і **Глеб Галкін** – па 5,5. Леташні чэмпіён Беларусі **Міхаіл Нікіценка** фінішаваў дзявятым.

Кірыл Ступак – Міхаіл Нікіценка

1.d4 d5 2.Kf3 Kf6 3.Cg5 c6 4.e3 Фb6 5.Фc1 Cf5 6.Kbd2 Kbd7 7.Ce2 h6 8.Ch4 e6 9.c4 Ce7 10.h3 0-0 11.0-0 c5 12.Ke5 g5 13.dc K:c5 14.Cg3 Лac8 15.Ch2 Лfd8 16.b3 Kce4 17.K:e4 K:e4 18.Ch5 Kd6 19.Фa3 Cf8 20.Фa4 dc 21.bc Фa6 22.Фb3 f6 23.g4 Ce4 24.f3 fe 25.fe K:c4 26.Лf6 Cg7 27.Cf7+ Kph8 28.Л:e6 Лd6 29.Л:d6 K:d6 30.Ce6 Лc6 31.Лd1 Cf6 32.Cd7 Лc4 33.a4 Фa5 34.Cb5 Фc7 35.Л:d6 Ф:d6 36.C:c4 Фd2 37.Cg3 b6 38.Фd3 Фc1+ 39.Kpg2, 1:0.

Арцём Сіняўскі – Мікіта Маёраў

1.e4 e5 2.Kf3 Kc6 3.Cb5 a6 4.Ca4 Kf6 5.0-0 Ce7 6.Лe1 b5 7.Cb3 d6 8.c3 0-0 9.h3 Ka5 10.Cc2 c5 11.d4 Kd7 12.d5 Kb6 13.Kbd2 f5 14.ef C:f5 15.C:f5 Л:f5 16.Ke4 Фd7 17.b3 Фb7 18.c4 Фd7 19.Cd2 Kb7 20.Фe2 Лaf8 21.Kh2 Cd8 22.Kf1 Ch4 23.Ce3 Cd8 24.Kfd2 Kc8 25.cb ab 26.a4 Kb6 27.Ф:b5 Ф:b5 28.ab K:d5 29.Kc4 K:e3 30.K:e3 Л5f7 31.Лed1 Ka5 32.Лd3 Лb7 33.K:d6 Лd7 34.Лad1 Лf4 35.Kdf5 Л:d3 36.Л:d3 Cf6 37.b6 g6 38.g3 Лf3 39.Kd6 e4 40.K:e4 Cd4 41.b4 Kb7 42.bc C:c5, 1:0.

У жаночым першынстве склад быў моладзевы. Свой поспех 2019 года паўтарыла **Аляксандра Тарасенка** – 7 балаў. Столькі ж у **Яны Ільючык**, па дадатковых паказчыках яна другая. Бронза ў **Варвары Паляковай**. Леташняя чэмпіёнка **Ксенія Зелянцова** сёлета на пятым месцы.

Яна Ільючык – Аляксандра Тарасенка

1.c4 Kf6 2.Kc3 e6 3.g3 d5 4.Cg2 Ce7 5.Kf3 0-0 6.cd ed 7.d3 c5 8.0-0 d4 9.Kb1 Kc6 10.Cg5 Ce6 11.Фc1 Лc8 12.Kbd2 Kb4 13.a3 Kbd5 14.Ke4 K:e4 15.de Kb6 16.h4 Kc4 17.C:e7 Ф:e7 18.Kg5 Ka5 19.Фf4 Kb3 20.Лab1 Cc4 21.e5 f6 22.ef Л:f6 23.Фg4 Лe8 24.Лfe1 h6 25.Ke4 Лe6 26.f3 Лe5 27.Фh3 Cd5 28.Лbd1 c4 29.g4 C:e4 30.fe Фc5 31.Kph1 Л:e4 32.C:e4 Л:e4 33.Фf3 Фe7 34.Фg3 Лe3 35.Фf2 Фe4+ 36.Фg2 Лh3+ 37.Kpg1 Фe3+ 38.Kpf1 Фf4+ 39.Kpg1 Лg3, 0:1.

Юніёрскія медалі

Чэмпіянаты Беларусі сярод шахматыстаў да 20 гадоў сабралі па восем юнакоў і дзяўчат. У юнацкім турніры выступалі ў тым ліку адзін міжнародны майстар і пяць майстроў ФІДЭ. Перамог **Дзяніс Лазавік** – 5 балаў з 7 магчымых. На другім месцы **Максім Царук** (4,5), на трэцім – **Вячаслаў Зарубіцкі** (4,5), на чацвёртым – **Арцём Сіняўскі** (4).

Сярод удзельніц дзявочага турніру былі два майстры ФІДЭ. Упэўнена перамагла **Аляксандра Тарасенка**, якая выйграла шэсць партый пры адной нічыёй. Серабро ў **Ксеніі Норман** – 5,5 бала, бронза – у **Ксеніі Зелянцовай** (4,5), а чацвёртае месца заняла **Караліна Галоўчыц** (4).

Дзяніс Лазавік – Глеб Галкін

1.d4 Kf6 2.c4 g6 3.g3 Cg7 4.Cg2 d5 5.cd K:d5 6.Kf3 0-0 7.0-0 Kb6 8.Kc3 Kc6 9.e3 Лe8 10.h3 e5 11.d5 Ka5 12.Фc2 Cd7 13.Лd1 Kac4 14.e4 Фc8 15.Kph2 c6 16.b3 Kd6 17.Фd3 cd 18.K:d5 K:d5 19.Ф:d5 Лe6 20.Kg5 Лf6 21.Ca3 Cc6 22.Фd2 Cf8 23.Cb2 Ch6 24.C:e5 K:e4 25.K:e4 C:d2 26.K:f6+ Kpg7 27.Л:d2 C:g2 28.Kp:g2 Фc6+ 29.Kph2 h6 30.Лad1 Фb5, 1:0.

Дар'я Астапчык – Аляксандра Тарасенка

1.c4 e5 2.Kc3 Kf6 3.e4 Cc5 4.g3 d6 5.h3 Ce6 6.d3 c6 7.Kf3 h6 8.Cg2 Фd7 9.Фe2 a5 10.Ce3 Ka6 11.h4 Kg4 12.C:c5 dc 13.a3 0-0-0 14.Лd1 b6 15.Лd2 Kpb7 16.Kpd1 Лhe8 17.Kpc2 f5 18.b3 Фf7 19.Kh2 K:h2 20.Л:h2 f4 21.Ch3 Kc7 22.Фf3 C:h3 23.Л:h3 Ke6 24.Ke2 a4 25.Лh1 ab+ 26.Kp:b3 b5 27.Kpc3 Фc7 28.Лb2 Фa5+ 29.Kpb3 Лa8 30.Лa1 Kd4+ 31.K:d4 cd 32.Kpc2 Фc3+ 33.Kpb1 Фe1+ 34.Kpa2 Л:a3+ 35.Kp:a3 Лa8+ 36.Kpb3 Фc3x.

Дайшлі да фінішу

У Екацярынбургу завяршыўся турнір прэтэндэнтаў на сусветную карону. Першы этап яго адбыўся ў сакавіку 2020 года, пасля чаго турнір быў спынены з-за пандэміі. І вось праз год восем гросмайстраў правялі другі этап. Перамог **Ян Няпомняшчы** (Расія) – 8,5 бала з 14, на наступных месцах: 2) **Максім Ваш'е-Лаграў** (Францыя) – 8; 3–4) **Аніш Гіры** (Нідэрланды) і **Фабіяна Каруана** (ЗША) – па 7,5; 5–6) **Дзін Ліжэнь** (Кітай) і **Аляксандр Грышчук** (Расія) – па 7; 7) **Кірыл Аляксеенка** (Расія) – 5,5; 8) **Ван Хао** (Кітай) – 5. Такім чынам, матч на першынство свету з **Магнусам Карлсенам** (Нарвегія) згуляе Ян Няпомняшчы. Год таму пасля першага этапа лідзіраваў таксама ён, праўда, нароўні з М.Ваш'е-Лагравам.

Праверце адказы

Задача **М.Кошаля**, змешчаная ў «Народнай Волі» 25 мая, рашаецца: **1.Kh8!** Першымі правільна рашылі **Сяргей Галкін**, **Васіль Жуковіч**, **Ігар Ананіч**, **Віктар Жук**, **Сяргей Цяльпук**.

Вадзім ЖЫЛКО.

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 326-68-71
Рэкламны аддзел (017) 363-66-04
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info
Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ